обращались к балету, и наоборот, артисты балета и хореографы к изобразительному искусству.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Портнова, Т.В. Образы балета в русском изобразительном искусстве конца XIX – начала XX века: проблемы интерпретации и взаимосвязи искусств / Т.В. Портнова ; автореферат дис. на соискание ученой степени кандидата искусствоведения. – Москва, 1993. – 26 с.

2. Базанова, О.А. Взаимосвязь хореографии и пластических искусств / О.А. Базанова // Философско-культурологические исследования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: D1%84%D0%B8%D0%B8/. – Дата доступа: 05.02.2021.

3. Балет в изобразительном искусстве [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://veryimportantlot.com/ru/news/obchestvo-i-lyudi/balet-v-izobrazitelnom-iskusstve. – Дата доступа: 10.02.2021.

4. Русский балет в изобразительном искусстве [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://artandyou.ru/articles/znachenia_izo_v_formirovanyi_obraza_baleta/. – Дата доступа: 10.02.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гаевская А. А., студент 214 группы
Научный руководитель – Котович О. В., старший преподаватель

## СЕМАНТЫКА І СІМВОЛІКА АБРАДАВЫХ АТРЫБУТАЎ

Неад’емнай рысай любой культуры лічацца асобыя рытуальныя дзеянні або абрады, якія выконваюцца ў залежнасці ад правілаў і традыцый адпаведна пэўнай мясцовасці на працягу не аднаго дзесяцігоддзя. Так, і ў беларускай традыцыйнай культуры існуе вялікая разнастайнасць сакральных дзеянняў, звязаных са святочнай каляндарнай культурай і сямейна-родавым

абрадавым цыклам, якія аб'ядноўваюцца тым, што для іх выканання неабходны спецыяльныя прадметы або рэчы, якімі карыстаюцца ў ходзе рытуальнага дзеяння, і якія атрымалі назву "абрадавыя атрыбуты".

Існуе вялікая колькасць атрыбутаў, якія рыхтавалі непасрэдна для таго ці іншага абрадавага дзеяння. Даследчыкі беларускай культуры А. Катовіч і Я. Крук вылучылі наступныя групы атрыбутаў: «Прадметы, падрыхтаваныя спецыяльна: калядная "зорка"; пудзіла Масленіцы…; прадметы гаспадарчай дзейнасці або хатняга ужывання: хлебная дзяжа; хлебная лапата (яе выкідалі на двор падчас навальніцы, каб перасцерагчы сядзібу ад граду)...; прадметы хрысціянскага культа: крыж нацельны, грамнічная свечка…; прадметы прыроднага паходжання: зерне, веткі вярбы…; прадукты харчавання або спецыяльна прыгатаваныя стравы: пасхальнае яйка, калядная куцця…» [5, с. 289]. Акрамя таго, вылучаецца яшчэ адна група атрыбутаў, якімі карысталіся пры выкананні рытуалаў аказіянальнага характару, большасць з якіх тычылася выклікання або спынення дажджу. Каб паспрыяць змене надвор'я, жанчыны павінны былі саткаць за адзін дзень ручнік, які называлі «абыдзённік», «абудзёнаўка», «абудзённік», «дзённік», «дняўнік» [7, с.1183]. У навуковым шматтомным выданні «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» знаходзім наступныя аповяды жыхароў беларускіх вёсак, якія сцвярджалі, што гэты атрыбут меў вельмі глыбокі сэнс: «Як не было дажджу, дак сабіраліся, за дзень і напралі, і наткалі, і павесілі на растанцох.Ужэ былі красты, і вешалі на растанцы…Рана сабіраюцца, і за дзень ўсё зробяць. Эта старэйшыя рабілі…Толькі жанчыны. А мужчыны крэст рабілі.", "Гэта называўся рушік "абдзённік". Мы тожа ткалі. Як дажджа не было, ткалі, на крэст вешалі…Больш як два метры! Метраў тры мо і чатыры» [7, с.1191].

Сама падрыхтоўка або выраб атрыбута можна лічыць абрадавым дзеяннем. Яскравым прыкладам такога дзеяння з'яўляецца першы зажыначны сноп, які рыхтавалі спецыяльна, каб паспрыяць добраму ўраджаю. Як правіла, ён быў невялікі, перавязаны стужкай або невялікім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

поясам: «…як зажыналі жыта: зрэжуць жыта і зробяць перавясла, а тады зрэжуць жменьку жыта і паложаць на гэтае перавясла, перакруцяць і шчэ такую жменьку перакруцяць перавяслам і ў адзін пучок (Шчучынскі раён) » [1, с.282]. Паколькі першы сноп лічыўся сімвалам шчаслівага жыцця і дабрабыту, яго ўпрыгожвалі зелянінай, кветкамі, галінкамі, стужкамі: «Сноп вельмі ўпрыгожвалі кветкамі, лентамі, што снапа таго ня відаць» (в. Вуглы, Капыльскі раён). Жанчыны-жнеі, якія рабілі гэты сноп, неслі яго дадому і ўручалі гаспадару хаты. А той урачыста ставіў яго ў чырвоным куце. На наступны год, бліжэй да вясны яго акуратна абмалочвалі, зерне асвячалі і падмешвалі ў сявеньку падчас першых засевак: «Первы раз ідуць зажынаць, мама нажынала снапок жыта, а прыношвала гэты сноп на двор і ў хату…І патом эта жыта, як ідуць засяваць, у мяшочак сыплеш пасвяцонае жыта (в. Уюн, Быхаўскі раён)» [1, с. 284].

Важную ролю выконвалі шматлікія атрыбуты прыроднага паходжання. На прыкладзе аднаго з галаўнейшых свят беларусаў , Купалля, можна ўбачыць, якую значнасць мелі кветкі і расліны. Купальскія дні лічылі лепшым перыядам для нарыхтоўкі лекавых траў: «Падрыхтоўчая частка свята ў большасці раёнаў Беларусі пачыналася зборам кветак, раслін, траў…Гэта быў час найвялікшага росквіту раслін, а значыць і назапашвання ў іх лекавых рэчываў»[2, с. 21]. Гэтай справай займаліся дзяўчаты і жанчыны, і само гэтае дзеянне мела сваю сакральную мэту: «…дзяўчаты спяваюць спецыяльныя абрадавыя песні: гэта была своеасаблівая вербальная магія, якая выяўляла жаданне, каб кветкі і травы захавалі сваю гаючую і ахоўную сілу» [2, с. 22]. Існавала вялікая колькасць павер'яў, звязаных з купальскімі кветкамі. Іх выкарыстоўвалі не толькі з лекавай мэтай, але і для варажбы на лёс і шчасце: «…кветкі, вядомыя пад імем "купалка", кожны паасобку збіраў, хаваў і чакаў: расцвіце бутон яго кветкі ці не. Калі зусім не распусціцца, то верылі, што гэты чалавек хутка памрэ» [2, с. 23]; «У Барысаўскім раёне дагэтуль захавалася павер'е, што калі на Купалле сабраць зверабой, то ён захавае кароў ад нагавораў…» [2, с. 22].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У в. Данілевічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці і зараз захаваўся абрад пакланення так званай «каменнай дзяўчыне». Жыхары вёскі з шчырай верай расказваюць паданне, што ў гэты камень ператварылася дванаццацігадовая дзяўчынка, якая была праклята сваёй маці за непаваротлівасць. Яны складвалі сена ў копы, а тут наляцела дажджавая хмара. «Маці папрасіла непаслухмяную дачку паскорыць працу. Злое слова вылецела з вуснаў маці: «Каб ты каменем стала!» Тут ляснуў пярун — і дзяўчына скамянела. З цягам часу сталася так, што дзяўчына-камень (у якой фактычна захаваўся патэнцыял нерэалізаванай жанчыны-маці) стала дзіўным чынам садзейнічаць тым маладым жанчынам, якія з розных прычын не маглі нарадзіць дзіця» [8]. Вельмі прыгожы і лагічна абгрунтаваны ход народных разважанняў: паколькі ў зямным жыцці дзяўчына не змагла стаць маці, г. зн. нарадзіць, то яе патэнцыяльная здольнасць прадаўжальніцы роду «захавалася» ў камені, каб перадаць іншым жанчынам. З тых часоў у в. Данілевічы менавіта ў велікодную ноч да каменя прыходзяць жанчыны, становяцца на калені, прагаворваюць малітвы. А у якасці ахвяры павязваюць на «каменную дзевачку» фартушкі, стужкі, паясы.

Пасля прыняцця хрысціянства ў абрадавай дзейнасці беларусаў пачалося распаўсюджванне атрыбутаў, якія адпавядалі хрысціянскай культуры. Так, у кола абрадавых атрыбутаў трапіла адна з прыродных стыхій – вада. Лічылася, што ёсць асобыя дні, ў якія трэба было асвяціць ваду, што прыдавала ёй магічныя і лекавыя ўласцівасці. У кнізе А. Катовіч і А. Крука «Колесо времени. Традиции и современность» сцвярджаецца, што такая вада выкарыстоўвалася ў шматлікіх рытуальных дзеяннях: «для хрышчэння нованароджанага…, асвячэння дамоў і гаспадарчых пабудоў; для зняцця сурокаў і інш. уздзеянняў; для акраплення падчас абраду асвячэння ў Вербную нядзелю, на Вялікдзень, на Яблычны Спас; для асвячэння магілы перад самым пахаваннем і інш. » [6, с. 35]. Таксама, магічную ролю выконвалі асвечаныя ў храме свечкі. Яскравым прыкладам з'яўляецца грамнічная свечка, якую павінен быў зрабіць самастойна кожны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаспадар напярэдадні святкаваннем Грамніц (14.02.) з мэтай захаваць сваю хату ад усялякай бяды і нястачы: «Усе забудовы, узведзеныя рукамі гаспадара, трэба было абараніць ад варожый сілы агнём той свечкі» [3, с. 95]. Да прыгатавання гэтага абрадавага атрыбута ставіліся вельмі дакладна: «Воск для грамніц збіралі загадзя, а выраблялі іх ў апошнюю перад святам суботу…сакральным днём вырабу свечак сталася субота, якая з даўніх часоў была днём ушанавання продкаў» [3, с. 95]. Гэта гаворыць аб тым, што свечка мела не толькі абярэгавы сэнс, але і з'яўлялася сувяззю паміж жывымі і памёрлымі. На працягу года свечку хранілі дома, і карысталіся ёй ў асабістых выпадках, напрыклад, на Юр'я: «…трымаючы ў руках вербную галінку, грамніцу…гаспадыня тройчы абыходзіла карову перад першым выганам у поле» [3, с. 98].

Адным з найважнейшых атрыбутаў ў традыцыйнай культуры, з'яўляюцца стравы, які рыхтавалі па асобым правілам і канонам. Адным з галоўных прыкладаў гэтай групы атрыбутаў з'яўляецца куцця – густая каша, прыгатаваная з ячменю, жыта або іншых злакавых культур з дабаўленнем мёду, сушаных ягад: «Гатаваў калядную куццю ад пачатку і да заканчэння хтосьці адзін – сама гаспадыня, або…нявестка, замужняя дачка. Яна павінна была набраць зерне, перабраць яго, памыць, зварыць, астудзіць і паставіць на стол. Гэта павінна было забяспечыць сям'і адзінства і цэльнасць» [3, с. 34].

Таксама атрыбутамі з'яуляліся рэчы гаспадарчай дзейнасці. Напрыклад, з асобай павагай беларусы ставіліся да дзяжы. Дзяжа – гэта невялікая драўляная кадка, ў якой заквашвалі, вымешвалі «рашчыну» для выпякання хлеба. У культуры ўсходніх славян яна мела вялікі сэнс: «…стала сімвалам багацця, дабрабыту і здароўя» [4, с. 386]. Яна прымала непасрэдны ўдзел у вялікай колькасці абрадавых дзеянняў – вяселлем, хрэсьбінамі, будаўніцтвам хаты і наваселлем. Так, у час «…першымі ў дом ўпускалі ката, пеўня, а потым "уталквалі" дзяжу… каб ў хаце быў дастатак…каб дом быў вясёлым і багатым» [4, с. 386]. Дзяжа выконвала асобую ролю і ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеяннях вясельнага абраду. Вось толькі адзін з прыкладаў. У некаторых раёнах Беларусі, калі бацькі маладой сустракалі жаніха, то выносілі дзяжу з дома: «Малады, калі ён цнатлівы, саскоквае з воза проста на дзяжу…калі малады не захаваў маладзецкай красы, то саскоквае прама на зямлю»”[4, с. 399].

Штодзённае адзенне таксама станавілася «удзельнікам» абрадавага дзеяння. Напрыклад, кажух лічыўся сімвалам багацця, працягу роду і жыццёвых сіл: «З адной стараны, наяўнасць шэрсці надзяляла кажух ўласцівасцямі тагасветнага…с другой стараны…стаў сімвалам багацця» [4, с. 388]. Ён выконваў асобую ролю ў многіх сакральных дзеяннях, одно з якіх – рытуальнае пераапрананне гуртоў калядоўшчыках: «У кажух, вывернуты, каб на некаторы час стаць непазнавальнымі для аднавяскоўцаў і быць падобнымі на сваіх продкаў – татэмных жывёл – мядзведзя, казу, апраналіся калядоўшчыкі» [4, с. 398], каб спрыяць сваім аднавяскоўцам багата ўраджаю, багацця, дабрабыту і шчасця.

Такім чынам, абрадавы атрыбут – гэта спецыяльна прыгатаваны прадмет для уключэння яго ў прастору пэўнага рытуалу. Акрамя таго ў кола абрадавых атрыбутаў траплялі рэчы гаспадарчага прызначэння, прыгатаваная спецыяльна ежа, аб’екты прыроднага паходжання і інш. Мы разгледзелі асноўныя групы атрыбутаў, якія былі непасрэднымі удзельнікамі кожнага абрадавага дзеяння, і мелі свой сакральны, магічны сэнс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Валодзіна, Т.В. «Ядраное жыта гаспадара кліча...» : каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак Мінск : Беларуская навука, 2015. – 358 с.
2. Гуд, П. А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей : вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных установаў культуры і мастацтва / П.А. Гуд.

— Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2006. — 136 с.

3. Катовіч, А. Зімовыя святы : [нарысы] / Аксана Катовіч, Янка Крук. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 118 с.

4. Котович, О.В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / Оксана Котович, Янка Крук. - Минск : Адукацыя и выхаванне, 2012. - 848 с.

5. Котович, О.В. Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры / Оксана Котович, Янка Крук. - Минск: Адукацыя і выхаванне, 2019. - 576 с.

6. Крук Я. Колесо времени: традиции и современность / Янка Крук, Оксана Котович. – Минск: Беларусь, 2005. – 350 с.

7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2-х кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]; аўт. Ідэі Т, Б. Варфаламеева; агул. Рэд. Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск: Выш. шк., 2013. — 1231 с.

8. http://zviazda.by/be/news/20170217/1487346163-kamen-yak-simval-rodavay-pamyaci-belarusau Дата доступу: 07.03.2021

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гайдук А. В.,студент 508 группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Песецкая Т. И.,
кандидат физико-математических наук, доцент

## ИНФОРМАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В СОЗДАНИИ ДЕТСКОЙ КНИГИ: ТРАДИЦИИ И ИННОВАЦИИ

Книги являются важной частью жизни любого человека. Для кого-то книга это развлечение, а для кого-то источник нового знания. Несмотря на то, какую литературу предпочитает каждый читатель, прочтенная книга